Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа*
*і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

2020

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені ОСВО1-23 01 12 – 2013 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках). Рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-86/17, Е 23-1-87/17 ад 4 ліпеня 2017 г.


**СКЛАДАЛЬНІК**

*І. І. Бамбешка*, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ж. Л. Раманава,* загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;

*Н. В. Барабаш,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 26 красавіка 2019 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 28 мая 2019 г.)


Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

Адказны за выпуск: І. І. Бамбешка


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасным свеце музей трывала зарэкамендаваў сябе як поліфункцыянальны сацыякультурны інстытут, які валодае шырокімі магчымасцямі для фарміравання асобы. Музейная сетка прадстаўлена living рознымі яго відамі: ад класічных профільных устаноў, арыентаваных на прэзентацыю асобных феноменаў гісторыі і культуры, да «жывых» музеяў, якія ахопліваюць значныя тэрыторыі і аднаўляюць цэлыя пласты прыроды, гісторыі і культуры. Такая разнастайнасць музейных устаноў і важнасць музеяў у жыцці сучаснага грамадства пацвярджае думку аб тым, што музейнай мове, гісторыі і практыцы музейнай справы неабходна вучыцца прафесійна. Гэта дазволіць належным чынам уключаць музейныя прадметы ў кантэкст складаных культурна-гістарычных сувязей, якія ўзнаўляюцца музеямі ў адпаведнасці з сучасным разуменнем культурных традыцый. Такія абставіны робяць вучэбную дысцыпліну «Тэорыя і методыка музейнай справы» надзвычай актуальнай і важнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне музеязнаўчых навыкаў, неабходных спецыялісту для работы ва ўмовах музея.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміраваць уяўленне аб спецыфіцы музея як сацыякультурнага інстытута;

– сфарміраваць уяўленні аб кірунках дзейнасці сучаснага музея;

– сфарміраваць прафесійныя навыкі і ўменні ў арганізацыі музейнай справы.

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя і методыка музейнай справы» з’яўляецца асноўнай і фундаментальнай вучэбнай дысцыплінай пры падрыхтоўцы спецыялістаў-музеязнаўцаў і абавязковым элементам цыкла агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– структуру, асноўныя паняцці і тэрміны музеялогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тэарэтычныя і метадычныя аспекты камплектавання, захавання, уліку і вывучэння фондавых калекцый;

– тэарэтычныя і метадычныя аспекты праектавання музейных экспазіцый і выставак;

– тэарэтычныя і метадычныя аспекты культурна-адукацыйнай дзейнасці музея;

– арганізацыю сучаснай дзейнасці музея.

Студэнты павінны *ўмець*:

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці, тэрміны, навыкі і фактычны матэрыял па музеялогіі ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;

– аналізаваць крыніцы па сучасным стане музейнай справы;

– даць характарыстыку сучаснаму стану музеяў, музейнага фонду і нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– вызначаць пагрозы існаванню музеяў і музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь;

– выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці юрыдычна-прававую базу дзейнасці музеяў Рэспублікі Беларусь.

Студэнты павінны *валодаць*:

– асноўнымі метадамі музеязнаўчых даследаванняў;

– асноўнымі прыёмамі аналізу музейнай справы ў сучасным свеце і Беларусі;

– метадамі і прыёмамі збору і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках):

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць дзейнасць службаў кіравання музейнай справай, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, адукацыі і турызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-19. Ацэньваць канкурэнтаздольнасць і эканамічную эфектыўнасць распрацоўваемых музейных тэхналогій.

ПК-21. Складаць дамовы аб сумеснай дзейнасці па засваенні новых тэхналогій.

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя і методыка музейнай справы» цесна звязана з дысцыплінамі агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя музейнай справы», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Музеі Беларусі», «Крыніцазнаўства», «Тэорыя і гісторыя культуры» і інш.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і методыка музейнай справы» рэкамендуецца выкарыстоўваць тэхналогіі для актывізацыі разумовай дзейнасці студэнтаў (метад праблемных сітуацый, метад актывізуючых пытанняў, метад разважання ўслых і інш.).

Усяго па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і методыка музейнай справы» вучэбным планам прадугледжана 180 гадзін, з іх 82 – аўдыторныя гадзіны (48 гадзін – лекцыі, 34 – семінарскія заняткі). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме гуманітарнай адукацыі як базавай па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме спецыяльных дысцыплін.

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет і структура вучэбнай дысцыпліны. Крыніцы і літаратура.

## Раздзел I. Агульная тэорыя музеязнаўства (метамузеялогія)

### *Тэма 1. Гісторыя станаўлення музеязнаўства як навуковай дысцыпліны*

Праблема перыядызацыі музеялогіі. Крытэрыі для вылучэння асобных перыядаў. Канцэпцыі «музейных рэвалюцый» і «эмансіпацыі музеялогіі».

Этапы развіцця музеялогіі. Данавуковая стадыя развіцця музеялогіі (сярэдзіна XVI – канец XIX ст.). Першыя даследаванні па музеялогіі. Працы С. фон Кічэберга (1565), І. Д. Маёра (1674), К. Ф. Нікеліуса (1727), К. Лінея (1753), Г. Клема (1837) і інш.

Эмпірычна-апісальная стадыя (канец XIX – 1960-я гг.). І. Г. Т. фон Грэсе і «Часопіс па музеялогіі і антыкваразнаўстве». Тэарэтычныя пытанні музеязнаўства ў першых перыядычных выданнях. Прафесіяналізацыя музейнага сектара. Пошук новых мадэлей музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Праект «ідэальнага музея» М. Ф. Фёдарава. Канцэпцыі «карыснага музея» Дж. К. Даны і «жывога музея» П. А. Фларэнскага. Распрацоўка пытанняў музеялогіі ў СССР. Выданні 1930-х гг. па тэарэтычных і практычных пытаннях музеялогіі. Утварэнне і дзейнасць ІКОМ.

Стадыя тэорыі і сінтэзу (1960-я гг. – пачатак XXI ст.). Фарміраванне нацыянальных школ. Заходнееўрапейская (працы К. Хадсана, Д. Льюіса, Ж. А. Рыўера, Ю. Ромедэра, Д. Камерона, А. Хупер-Грынхіл і інш.), усходнееўрапейская (працы Ё. Бенеша, З. Странскага, І. Неуступнага, І. Ян, В. Хербста, К. Шрайнера, В. Глузіньскага, У. Свяцімскага і інш.), амерыканская (Д. Камерон, В. Вошберн, Ж. Буркоў і інш.), савецкая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(даследаванні А. М. Разгона, М. Б. Гнядоўскага, У. Ю. Дукельскага, А. І. Міхайлоўскай, С. А. Каспарынскай, Д. А. Равіковіч і інш.) школы. Стварэнне і дзейнасць IKOFOM. Кірункі сучасных музеязнаўчых даследаванняў на постсавецкай прасторы.

Музеязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь. Працы А. А. Гужалоўскага, А. М. Калбаскі, А. Б. Сташкевіч, В. У. Мірончык і інш. Выданне «Музейных сшыткаў».

### *Тэма 2. Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна*

Вызначэнне музеязнаўства як навуковай дысцыпліны. Аб'ект музеязнаўства. Разуменне яго як гістарычнай формы існавання грамадскай патрэбы ў адборы, захаванні і выкарыстанні музейнасці. Фарміраванне ўяўленняў аб уласным прадмеце музеязнаўства. Праблема трактоўкі прадмета музеязнаўства. Канцэптуальныя падыходы да вызначэння прадмета музеязнаўства: інстытуцыянальны, камунікацыйны, прадметны, моўны, аксіялагічны і комплексны. Прадмет музеязнаўства. Праблемнае поле музеязнаўства.

Структурна-функцыянальны падыход да музеязнаўства. Суадносіны паняццяў «музеязнаўства» і «музейная справа». Погляды даследчыкаў на структуру музеязнаўства. Агульнае і спецыяльнае музеязнаўства. Узаемасувязь тэарэтычнага і прыкладнога музеязнаўства. Складовыя элементы музеязнаўства: генетычны (гісторыя музейнай справы), структурны (тэорыя дакументавання, тэорыя тэзаўравання, тэорыя музейнай камунікацыі) і практычны (прыкладное музеязнаўства) аспекты.

### *Тэма 3. Мова музеязнаўства*

Уласная тэрміналогія як прыкмета самастойнай навуковай дысцыпліны. Тэрміналагічныя праблемы навукі. Міжнародны характар і ступень распрацаванасці мовы музеязнаўчай навукі. Фарміраванне паняційнага апарату музеязнаўства.

Рэзалюцыі Генеральнай канферэнцыі ICOM (1965) аб стварэнні музеялагічнага слоўніка. З'яўленне рэгіянальных музеялагічных слоўнікаў у 1970-я гг. Стварэнне працоўнай групы па падрыхтоўцы тэрміналагічнага слоўніка (1976). Выданне 20-моўнага гласарыя па музеялогіі (1986). Ключавыя паняцці музеялогіі (2012).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўка і выданне музейнай энцыклапедыі ў СССР і РФ. Расійская музейная энцыклапедыя (2001). Выданне «Слоўніка актуальных музейных тэрмінаў» (2009), «Ключавых паняццяў музеялогіі» (2012).

Фарміраванне беларускамоўнай музейнай тэрміналогіі. Перакладныя беларуска-англійскія і беларуска-рускія слоўнікі па музеялогіі.

### *Тэма 4. Метад музеязнаўства*

Метад як прыкмета навукі. Дыскусія аб метадзе музеязнаўства. Распрацоўка пытанняў метаду музеязнаўства ў музеязнаўчай літаратуры. Асаблівасці і характарыстыкі метаду музеязнаўства. Каштоўнасна-пазнавальны характар метаду музеязнаўства. Агульнанавуковыя і спецыяльна-навуковыя метады профільных і сумежных навук у сістэме метаду музеязнаўства. Значэнне гісторыка-аналітычнага і гісторыка-параўнальнага метадаў. Сістэмны аналіз у даследаванні музеязнаўчых праблем. Структурна-семіятычныя метады аналізу ў музеязнаўстве. Метад мадэлявання гісторыка-культурных і прыродных з'яў. Музейнае крыніцазнаўства як спецыфічны музеязнаўчы метад.

### *Тэма 5. Месца музеязнаўства ў сістэме навуковых ведаў*

Міждысцыплінарнасць музеязнаўства як спецыфічная сутнасць гэтай сферы ведаў. Музеязнаўства і іншыя сферы навуковых ведаў: агульнагуманітарныя, профільныя. Суадносіны і ўнутраныя сувязі.

Месца музеязнаўства ў структуры культуралагічнай навукова-даследчай і адукацыйнай праграм. Роля культуралагічных паняццяў у тэарэтычным, гістарычным і прыкладным музеязнаўстве.

### *Тэма 6. Фарміраванне ўяўленняў аб спецыфічнасці музейнага прадмета*

З'яўленне ўяўленняў аб спецыфіцы музейных прадметаў. Праца І. Д. Маёра. Фарміраванне паняццяў для абагульнення разнастайнасці назапашаных музейных скарбаў.

Погляды на музейны прадмет Н. Ф. Фёдарава. Распрацоўка музейна-прадметнай праблематыкі ў 1920–1930-я гг. Працы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ф. І. Шміта, М. М. Дружыніна. Роля І Усерасійскага музейнага з’езда ў зніжэнні цікавасці да тэорыі музейнага прадмета.

Выданне «Асноў савецкага музеязнаўства» (Масква, 1955). Зацвярджэнне тэрміна «музейны прадмет» у музеязнаўчай практыцы. Тэарэтычныя распрацоўкі 1960–1980-х гг. Даследаванні У. Ю. Дукельскага, У. У. Кандрацьева, М. А. Нікішына, А. М. Разгона і інш.

### *Тэма 7. Музейны прадмет у структуры музейнай справы*

Змест паняцця «музейны прадмет». Вызначэнне А. М. Разгона. Музейны прадмет як вылучаны з акаляючага асяроддзя прадмет музейнага значэння, уключаны ў музейны збор і здольны доўга захоўвацца. Суаднясенне паняццяў: прадмет музейнага значэння – музейны прадмет – музейны экспанат. Музейны прадмет як крыніца ведаў і эмацыянальнага ўздзеяння. Асноўныя ўласцівасці музейнага прадмета: інфармацыйнасць (паняцці «інфармацыйны патэнцыял», «інфармацыйнае поле»: знешняе і ўнутранае), экспрэсіўнасць, рэпрэзентатыўнасць, атрактыўнасць і асацыятыўнасць. Паняцце «музеяльнасці / музейнасці».

Аналіз каштоўнасці музейнага прадмета. Навуковая, гістарычная, мемарыяльная і мастацкая ці эстэтычная каштоўнасці. Паняцце тыповых і ўнікальных музейных прадметаў. Музейная каштоўнасць.

Функцыі музейнага прадмета. Пазіцыі У. У. Кандрацьева, Н. Я. Кучарэнкі. Генетычная, утылітарна-спажывецкая, навукова-пазнавальная, культурная, функцыі мадэлявання.

### *Тэма 8. Найноўшыя тэндэнцыі ў разуменні музейнага прадмета*

Вызначэнне музейнага прадмета з пазіцыі камунікацыйнага падыходу ў музеязнаўстве. Месца музейнага прадмета ў мадэлях акта музейнай камунікацыі Д. Камерона і А. Хупер-Грынхіл. Музейныя прадметы як знакі музейнай мовы. Семантычная характарыстыка музейнага прадмета.

Пашырэнне зместу музейнага прадмета. Нематэрыяльная спадчына як аб’ект музейнага калекцыяніравання. Магчымасці і межы выкарыстання нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў музейных мэтах. Абагульненне інфармацыі аб гэтай катэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

горыі помнікаў і падрыхтоўка да іх уключэння ў экспазіцыйны ансамбль ці да самастойнага паказу.

### *Тэма 9. Музейнае крыніцазнаўства*

Праблема вызначэння крыніцы. Дваістая прырода гістарычнай крыніцы. Музейны прадмет як гістарычная крыніца.

Аб'ект і прадмет музейнага крыніцазнаўства. Погляды А. М. Разгона, Н. П. Фінягінай, Я. А. Варанцовай, Н. Г. Самарынай і інш. Акцэнт на вывучэнні семантычнай інфармацыі і спецыфічных уласцівасцей музейных прадметаў. Традыцыйнае і нетрадыцыйнае крыніцазнаўства. Класіфікацыя крыніц. Прынцыпы класіфікацыі. Статычныя і дынамічныя крыніцы.

Крыніцазнаўчая эўрыстыка. Крыніцазнаўчая крытыка.

## Раздзел II. Тэарэтычнае музеязнаўства

### *Тэма 10. Трансфармацыя сэнсу музея ў гісторыі*

Этымалогія паняцця «музей». Тэорыі паходжання музеяў: суб'ектыўна-эстэтычная, біялагічная, філалагічная, «музей як сродак адыходу ад невыноснага сённяшняга дня», сацыяльная і інш. Этапы фарміравання музея як сацыяльнага інстытута.

Музей у грэка-рымскай цывілізацыі: музей як сінкрэтычны храм навук, мастацтваў і памяці, як спецыялізаваны навуковы комплекс, які ўвасабляе пазнавальны погляд на акаляючае асяроддзе. Музей у культуры Адраджэння. Музей у культурнай традыцыі эпохі Асветы.

Ідэі нацыянальнага музея. Праекты Ф. Адэлунга, Б. Віхмана, Т. Зана.

Пошук новых мадэлей музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Праект «ідэальнага музея» М. Ф. Фёдарава і яго філасофская канцэпцыя (узнаўленне жыцця і культуры былых «ушедших» каленняў). Новае ў характары музейнай дзейнасці. Набор музейных прадметаў. Ідэі міждысцыплінарнасці («Музей для ўсіх навук»). Ідэальны музей у структуры навукі, адукацыі і выхавання.

Канцэпцыя «карыснага музея» Дж. К. Даны. Ідэя дэмакратызацыі музея ў ЗША. Функцыі і мэта «жывога музея». Паняцце «музейнага прадмета» (па Дж. К. Дану).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канцэпцыя «жывога музея» П. А. Фларэнскага. Даклад камісіі па ахове помнікаў Кіева-Пячэрскай Лаўры. Абгрунтаванне музейнай каштоўнасці Лаўры. Функцыянальны метад і «жывы музей». Асаблівасці музея-храма. Станаўленне і развіццё ідэй дэмакратызацыі музея. Дж. К. Дана і яго ідэя «карыснага музея».

Музей у эпоху постмадэрнізму. Традыцыі і навацыі ў дзейнасці музея па адборы, захаванні і інтэрпрэтацыі прыродных і гісторыка-культурных аб'ектаў і прадметаў у сучасных умовах. Ідэі «музея без сцен» (А. Мальро), «музея-кантэксту» (П. Мейран), «экамузея» (Ж. А. Рыўер) і рэаліі музейнай дзейнасці. Сучасныя гледжанні на музей у працах В. У. Бяззубавай, У. М. Грусмана, Т. П. Калугінай, А. М. Масценіцы, В. С. Сапанжы, Л. М. Шляхціна і інш.

### *Тэма 11. Культурная і сацыяльная сутнасць музея*

Вызначэнне тэрміна «музей». Падыходы да вызначэння паняцця «музей». Вызначэнне музея ў статуце ІКОМ. Вызначэнне музея ў Расійскай музейнай энцыклапедыі (М. Е. Каулен), З. Странскага, Д. Камерона «Музей: храм ці форум?». Навуковыя цэнтры, якія вядуць экспазіцыйную дзейнасць. Дзяржаўная музейная сетка Рэспублікі Беларусь.

Сацыякультурныя функцыі музея: дакументаванне, адукацыйна-выхаваўчая, арганізацыя вольнага часу. Яўныя і латэнтныя функцыі музея. Адносная самастойнасць і характар узаемадзеяння функцый музея, іх стабільнасць і дынамізм. Асаблівасці рэалізацыі функцый у розных музеях. М. Д. Гнядоўскі і крытычнае стаўленне да функцыянальнай характарыстыкі музейнай дзейнасці. Дынаміка функцый музеяў. Прагнозы эвалюцыі функцый музея. Формы рэалізацыі музеямі сацыяльных функцый.

Асноўныя задачы музея як установы культуры. Паняцце «профіль музея» і профільная класіфікацыя. Гістарычныя музеі: асноўныя групы (гістарычныя, мастацкія, літаратурныя, прыроданавуковыя, музычныя, тэатральныя, архітэктурныя, навукова-тэхнічныя, педагагічныя, сельскагаспадарчыя, прамысловыя, комплексныя). Класіфікацыя па адміністратыўнай прыкмеце. Класіфікацыя музеяў па юрыдычным прынцыпе: дзяржаўныя і прыватныя музеі. Класіфікацыя музеяў па прык-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

меце грамадскага прызначэння: навукова-даследчыя, навукова-асветніцкія, вучэбныя і дзіцячыя. Класіфікацыя па спосабе дакументавання рэальнасці: музеі калекцыйныя, ансамблевыя і асяроддзевыя музеі. Музеі-сядзібы. Музеі пад адкрытым небам: паняцце, вопыт стварэння за мяжой і ў Рэспубліцы Беларусь. Прынцыпы арганізацыі музеяў пад адкрытым небам (па І. В. Макавецкаму). Дзве асноўныя групы музеяў пад адкрытым небам: комплексныя і спецыялізаваныя. Музеі-запаведнікі. Вядомыя музеі пад адкрытым небам. Гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі. Паняцце і гісторыя фарміравання. Музеі-храмы і музеі-манастыры. Музей-храм: паняцце і асаблівасці. Музей-манастыр: паняцце і спецыфіка. Мемаральныя музеі-кватэры і музеі-сядзібы як віды музеяў. Паняцце, разнавіднасці, перспектывы развіцця музеяў-кватэр. Музеі-сядзібы: паняцце і асаблівасці арганізацыі. Вопыт стварэння і функцыянавання ў Рэспубліцы Беларусь музеяў-кватэр, музеяў-сядзіб. Музей-сядзіба «Здраўнёва» і інш., Літаратурны музей Петруся Броўкі (музей-кватэра), Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (дом-музей), музеі-майстэрні і інш.

Характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы. Гістарычны падыход да вызначэння функцый музея. Тыпалогія і класіфікацыя музея як дыскусійная праблема. Сучасныя класіфікацыі музеяў па сутнасных прыкметах. Крытэрыі для вылучэння груп музеяў. Узнікненне новых фарміраванняў музейнага характару: музей-запаведнік, цэнтр культурнай спадчыны, нацыянальныя паркі і інш.

Паняцце «музейная сетка». Дынаміка і агульныя тэндэнцыі развіцця музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Структура музейнай сеткі.

### *Тэма 12. Тэорыя дакументавання ў музеязнаўстве*

Паняцце навуковага дакументавання ў сучасным музеязнаўстве. Навуковае дакументаванне з’яў, працэсаў прыроды і грамадства як спецыфічны тып музеялагічнага даследавання.

Мэта і сэнс дакументавання. Прынцыпы і крытэрыі дакументавання. Кагнітыўна-каштоўнасны характар музейнага дакументавання. Паняцці «рэч», «прадмет музейнага значэння», «музейны прадмет».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Залежнасць характару дакументавання ад тыпу і профілю музеяў.

Праблема навуковага дакументавання жывых, дзеючых сацыяльных сістэм. Дакументаванне сучаснасці.

### *Тэма 13. Тэорыя тэзаўравання ў музеязнаўстве*

Паняцце тэзаўрацыі і яе інтэрпрэтацыя ў сучасным музеязнаўстве. Тэзаўрацыя як другая ступень вывучэння музейнасці, яе пазнання, улік і ахова.

Працэс стварэння фонду музейных прадметаў як адзін з элементаў тэзаўравання. Музейны фонд як «новая культурная рэальнасць». Паняцці «музейная калекцыя» і «музейны збор». Прынцыпы вывучэння музейных збораў як асаблівай мадэлі рэальнага асяроддзя і дакументальнай сістэмы. Класіфікацыя, сістэматызацыя і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў у кантэксце тэзаўравання. Значэнне навуковай арганізацыі фондаў. Паняцце «другасная дакументацыя».

Сучасныя тэхналогіі ўліку музейных прадметаў. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі і тэзаўраванне. Ахова музейных прадметаў і інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца, як адзін з элементаў тэзаўрацыі.

### *Тэма 14. Тэорыя камунікацыі ў музеязнаўстве*

Музейная форма камунікацыі. Роднасць з іншымі формамі культурнай камунікацыі. Тэарэтычныя перадумовы камунікатыўнага падыходу ў музеязнаўстве.

Паняцце сацыяльнай мовы. Асноўныя тыпы культурнай і музейнай камунікацыі. Спецыфічнасць музейнай камунікацыі. Асноўныя метадалагічныя канцэпцыі музейнай камунікацыі. Музейна-камунікацыйныя мадэлі.

Эфектыўнасць і шматграннасць музейнай камунікацыі. Міждысцыплінарнае супрацоўніцтва ў працэсе музейнай камунікацыі.

## Раздзел III. Прыкладное музеязнаўства (музеяграфія)

### *Тэма 15. Музеяграфія ў сістэме ведаў аб музеі*

Вывучэнне музейнай практыкі, аналіз розных аспектаў функцыянавання музея. Праблемы музеязнаўства і яго месца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў навуковым абгрунтаванні прыкладнога музеязнаўства, асаблівасці выкарыстання агульных і спецыяльных методык з улікам аб'екта даследавання.

Паняцце «прыкладное музеязнаўства». Фарміраванне музеяграфіі ў працэсе назапашвання і абагульнення вопыту практычнай дзейнасці музея.

Прадмет прыкладнога музеязнаўства. Вывучэнне рэальнай музейнай практыкі і аналіз разнастайных аспектаў функцыянавання музея як інстытута.

Навуковыя методыкі і тэхналогіі як аснова прыкладнога музеязнаўства. Агульныя і спецыяльныя методыкі, асаблівасці іх выкарыстання з улікам аб'екта даследавання. Абумоўленасць фарміравання навуковай методыкі і тэхналогіі прыкладнога музеязнаўства развіццём гуманітарных, прыроданавуковых, тэхнічных навук і тэорыі музеязнаўства.

Структура прыкладнога музеязнаўства і яе суадносіны са структурай музеязнаўства як тэарэтычнай асновы асэнсавання практычнай дзейнасці музея.

### *Тэма 16. Навукова-фондавая дзейнасць музея*

Паняцце «фонды музея». Структура і тыпалогія музейных фондаў. Паняцце «навуковае камплектаванне» музейных збораў. Асноўныя кірункі фондавай работы музея.

Навуковае камплектаванне як элемент навуковай канцэпцыі музея. Прынцыпы адбору прадметаў музейнага значэння ў фондавы збор. Спецыфіка камплектавання фондаў музеяў розных профіляў і тыпаў. Дакументацыя ў працэсе камплектавання фондаў. Пытанні міжмузейнай каардынацыі падчас камплектавання фондаў.

Юрыдычны і навуковы аспекты ўліку музейных фондаў. Асноўныя этапы ўліку фондаў. Прызначэнне і структура навукова-даведачнага апарату. Камп'ютарызацыя музейных фондаў як форма вывучэння, уліку і выкарыстання фондаў. Музейная каталагізацыя і інфармацыйныя сістэмы.

Этапы і методыка вывучэння музейнага прадмета і фіксацыя яго вынікаў. Змест паняццяў: класіфікацыя, сістэматызацыя, інтэрпрэтацыя, атрыбуцыя як этапы вывучэння музейнага прадмета. Асаблівасці класіфікацыі рознага віду прадметаў: па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяле, спосабе, месцы і часе яго вырабу, аўтарскай, сацыяльнай, этнічнай прыналежнасці і інш.

Методыка манаграфічнага вывучэння музейнага прадмета. Вывучэнне музейных калекцый, комплексаў, асяроддзя бытавання прадметаў музейнага значэння, яго музейнай каштоўнасці.

Тэарэтычныя асновы інтэрпрэтацыі помнікаў і дакументаў мінулага. Выкарыстанне семіятычнага падыходу і асноўных функцый семіётыкі.

Методыка інвентарызацыі і каталагізацыі музейных прадметаў. Формы фіксацыі і навуковага апісання музейных прадметаў. Навуковыя асновы, методыка і тэхніка захавання музейнага збору. «Адкрытыя фонды» як сучасная тэхналогія захавання і выкарыстання музейнага збору.

Паняцце аб сістэме захавання музейных фондаў. Рэжымы музейнага захавання як навуковая праблема. Патрабаванні да будынкаў музеяў і фондасховішч. Умовы захавання музейных прадметаў у залежнасці ад ступені захаванасці і схільнасці матэрыялу да ўздзеяння знешніх умоў. Сістэмы захавання ў фондасховішчах, на экспазіцыі, пры транспарціроўцы.

### *Тэма 17. Навуковае і мастацкае праектаванне музейнай экспазіцыі*

Генезіс і эвалюцыя экспазіцыі. Тэндэнцыі развіцця экспазіцыйнай прасторы музея. Паняцці «масавая» і «элітарная» экспазіцыі.

Экспазіцыя як адна з форм навуковай работы музея і спецыфічная форма публікацыі музейных збораў. Псіхалагічныя аспекты музейнай экспазіцыі. Праблема суадносін зместу і формы музейнай экспазіцыі.

Навуковая канцэпцыя і прынцыпы арганізацыі экспазіцыйнай прасторы. Тыпалогія экспазіцыі і яе залежнасць ад профілю музея і асаблівасцей экспануемага матэрыялу. Прынцыпы ўзаемадзеяння аб’екта экспанавання і экспазіцыйнай прасторы. Канцэптуальныя экспазіцыі і экспазіцыя пазітывісцкая. Экспазіцыя комплексу і экспазіцыя аднаго прадмета. Фактары, якія ўплываюць на выбар пэўнага тыпу музейнай экспазіцыі.

Унутраная структура метадаў арганізацыі музейнай экспазіцыі. Традыцыйныя метады стварэння музейнай экспазіцыі: сі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стэматычны, тэматычны, ансамблевы. Варыянты класіфікацыі метадаў арганізацыі музейнай экспазіцыі.

Экспазіцыйныя матэрыялы. Канцэнтрацыя і абагульненне інфармацыі аб музейным прадмеце і афармленні яго да паказу ў адпаведнасці з канцэптуальнай асновай экспазіцыі. Экспазіцыя як сінтэз навукі і мастацтва. Прынцыпы арганізацыйна-прасторавага асяроддзя ў музейнай экспазіцыі. Паняцце аб выстаўцы як форме экспазіцыйнай работы музея. Тыпы і віды выставак.

Экспазіцыйнае абсталяванне як сродак арганізацыі прасторы для кампазіцыйных рашэнняў.

### *Тэма 18. Музейная педагогіка як метадалогія і методыка рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчай функцыі музея*

Гістарычныя перадумовы фарміравання музейнай педагогікі. Залежнасць адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці музея, яе зместу і задач ад канкрэтнай палітыка-эканамічнай і культурнай сітуацыі ў грамадстве.

Тэарэтычныя асновы музейнай педагогікі. Роля музейнага прадмета і музейнага асяроддзя ў арганізацыі музейна-адукацыйнага працэсу.

Асноўныя кірункі музейнай педагогікі. Формы работы з наведвальнікамі і класіфікацыя гэтых форм. Пазамузейныя формы адукацыйна-выхаваўчай работы. Феномен дзіцячага музея. Формы і метады выхавання ў наведвальнікаў музейнай культуры.

Музейная аўдыторыя як аб’ект музеязнаўчага даследавання. Метады псіхалогіі, педагогікі, сацыялогіі і музеязнаўства ў вывучэнні музейнай аўдыторыі, выніковасці форм і метадаў адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці. Асноўныя працэдуры сацыялагічнага даследавання. Навуковае абгрунтаванне дыферэнцыраванага падыходу да наведвальнікаў музея. Апрабацыя і ўкараненне найбольш адэкватных форм і метадаў работы.

### *Тэма 19. Арганізацыйна-кіраўнічыя асновы дзейнасці музея*

Сістэма менеджменту ў сферы культуры. Культура і рынак. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы культуры. Асаблівасці маркетынгу ў сферы культуры. Спонсарства і мецэнацтва ў культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заканадаўчыя асновы музейнай дзейнасці. Навуковая, арганізацыйная і тэхнічная структура музея. Адміністрацыйны корпус музея і праблема яго прафесіяналізму.

Праблема праграмавання і фінансавання дзейнасці музея ў сучасных умовах. Спосабы фінансавання. Сістэма работы з персаналам музея. Стымуляванне і матывацыі супрацоўнікаў музея.

Паняцце «музейны маркетынг» як спецыфічны від кіраўнічай дзейнасці музея. Асаблівасці выяўлення запытаў рэальных і патэнцыяльных наведвальнікаў музея і метадаў іх задавальнення. Роля маркетынгу ў знешнеэканамічнай дзейнасці музея. Маркетынг як філасофія музейнай вытворчасці. Агульныя і прыватныя крытэрыі эфектыўнасці музейнага маркетынгу і навуковыя метады іх вывучэння.

Сувязі музеяў з грамадскасцю (PR). Фарміраванне іміджу музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных адзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі | | |
| Уводзіны | 0.5 | | | |
| **Раздзел I. Агульная тэорыя музеязнаўства (метамузеялогія)** | | | | |
| **Тэма 1.** Гісторыя станаўлення музеязнаўства як навуковай дысцыпліны | 3.5 | 4 | 1 | канспектаванне прац па музеязнаўстве |
| **Тэма 2.** Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна | 3 | 2 | 1 | складанне праекта тэрміналагічнага слоўніка |
| **Тэма 3.** Мова музеязнаўства | 1 | | 1 | |
| **Тэма 4.** Метад музеязнаўства | 1 | | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 5.** Месца музеязнаўства ў сістэме навуковых ведаў | 1 | | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 6.** Фарміраванне ўяўленняў аб спецыфічнасці музейнага прадмета | 1 | 2 | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 7.** Музейны прадмет у структуры музейнай справы | 4 | | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 8.** Найноўшыя тэндэнцыі ў разуменні музейнага прадмета | 1 | | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 9.** Музейнае крыніцазнаўства | | 2 | 0.5 | выступленне на семінары |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Раздзел II. Тэарэтычнае музеязнаўства** | | | | |
| **Тэма 10.** Трансфармацыя сэнсу музея ў гісторыі | 1 | 2 | 1 | напісанне эсэ |
| **Тэма 11.** Культурная і сацыяльная сутнасць музея | 2 | 2 | 1 | напісанне эсэ |
| **Тэма 12.** Тэорыя дакументавання ў музеязнаўстве | 1 | 1 | 1 | канспектаванне прац па музеязнаўстве |
| **Тэма 13.** Тэорыя тэзаўравання ў музеязнаўстве | 1 | 1 | 1 | канспектаванне прац па музеязнаўстве |
| **Тэма 14.** Тэорыя камунікацыі ў музеязнаўстве | 4 | 2 | 1 | канспектаванне прац па музеязнаўстве |
| **Раздзел III. Прыкладное музеязнаўства (музеяграфія)** | | | | |
| **Тэма 15.** Музеяграфія ў сістэме ведаў аб музеі | 1 | | 1 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 16.** Навукова-фондавая дзейнасць музея | 4 | 2 | 1 | выступленне на семінары, праверка творчых заданняў, праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 17.** Навуковае і мастацкае праектаванне музейнай экспазіцыі | 4 | 2 | 1 | выступленне на семінары, праверка творчых заданняў, праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 18.** Музейная педагогіка як метадалогія і методыка рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчай функцыі музея | 4 | 2 | 1 | выступленне на семінары |
| **Тэма 19.** Арганізацыйна-кіраўнічыя асновы дзейнасці музея | 2 | | 0.5 | падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Разам …** | **40** | **24** | **18** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Ананьев, В. Г.* История зарубежной музеологии : учеб.-метод. пособие / В. Г. Ананьев. – СПб. : СПбГУ, 2014. – 134 с.

*2. Калбаска, А. М.* Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію / А. М. Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.

*3. Камерон, Д.* Музей: храм или форум? / Д. Камерон // Музейное дело. Музей – культура – общество. – М., 1992. – С. 259–275. – (Сб. науч. тр. / Музей революции. Вып. 21).

*4.* Ключевые понятия музеологии : пер. / сост.: André Desvallées и François Mairesse. – М. : ИКОМ России, 2012. – 101 с.

*5.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г. : адобр. Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 2016 г. : уступае ў сілу з 3 лютага 2017 года. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 270, [1] с.

*6.* Музееведение. Музеи исторического профиля : учеб. пособие для вузов по специальности «история» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

*7.* Музееведение. Музеи мира : сб. науч. тр. / НИИ культуры. – М., 1991. – 384 с.

*8.* Музейное дело в России / под ред. М. Е. Каулен (отв. ред.), И. М. Коссовой, А. А. Сундиевой. – 2-е изд. – М. : Изд-во «ВК», 2005. – 614 с.

*9.* Основы музееведения : учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : ЕдиториалУРСС, 2005. – 504 с.

*10. Сапанжа, О. С.* Основы музейной коммуникации / О. С. Сапанжа ; М-во образования и науки РФ, РГПУ им. А. И. Герцена, Федеральное агентство по культуре и кинематографии, ФГУК «Государственный Русский музей», РЦМПиДТ. – СПб. : ГРМ, 2007. – 115 с.

*11.* Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 9. – С. 47–68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Сотникова, С. И.* Музеология : пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.

*13. Столяров, Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика : учеб. пособие / Б. А. Столяров. – М. : Высш. шк., 2004. – 216 с.

*14. Томилов, Н. А.* Музееведение и музеи России / Н. А. Томилов. Ч. 1 : Музееведение (музеология): теоретические и историографические аспекты. – 2016. – 364, [3] с.

*15.* Философия музея : учеб. пособие / М. Б. Пиотровский [и др.]. – М. : Инфра-М, 2014. – 192 с.

*16. Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела: теория и практика : учеб. пособие для студентов, обучающихся по направлению «Музеология и охрана объектов культурного и природного наследия» / Л. М. Шляхтина. – Изд. 3-е, доп. – СПб. [и др.] : Лань : Планета музыки, печ. 2015 (макет 2016). – 246, [1] с. – (Учебники для вузов. Специальная литература).

*17. Шола, Т.* Предмет и особенности музеологии / Т. Шола // Museum. – 1987. – № 153. – С. 49–53.

*18. Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учебник для высш. шк. / Т. Ю. Юренева. – М. : Акад. проект, 2003. – 558 с.

*Дадатковая*

*1. Гедзімін, Л. А.* Руска-беларускі слоўнік музейнай тэрміналогіі / Л. А. Гедзімін ; БДУ, філалагічны фак., каф. гісторыі беларускай мовы. – Мінск : БДУ, 2017. – 37 с.

*2. Грегорова, А.* Музей и музееведение / А. Грегорова ; сост.: Н. Г. Куткина, В. Е. Лисюк. – М., 1986. – 16 с. – (Культура и искусство за рубежом. Сер.: Музейное дело и охрана памятников: Экспресс-информ / Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина. Информ-культура; вып. 1).

*3. Дукельский, В. Ю.* Терминологические проблемы теории музейного предмета / В. Ю. Дукельский // Терминологические проблемы музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР. – М., 1986. – С. 27–35.

*4. Лорд, Б.* Менеджмент в музейном деле : учеб. пособие / Б. Лорд, Г. Д. Лорд ; пер. с англ. Э. Н. Гусинского, Ю. И. Турчаниновой ; под ред. А. Б. Голубовского. – М. : Логос, 2002. – 254 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5.* Музеи как центры образования в XXI веке : практ. пособие / концепция сборника, подбор материалов и сост. текстов: К. Янеке, А. Сташкевич. – [Б. м. : б. и.], 2013. – 180 с.

*6.* Музеи Литвы и Беларуси: пути и перспективы развития в XXI веке : материалы конф., Минск – Вильнюс – Тракай, 2006–2007 / сост.: Е. Матевосян, В. Повилюнас, А. Сташкевич. – Минск, 2007. – 111 с.

*7.* Музеи. Маркетинг. Менеджмент : сб. ст. : практ. пособие / редкол.: С. Кози [и др.] (брит. сторона), В. Дукельский [и др.] (рос. сторона). – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 222 с.

*8.* Музей будущего: информационный менеджмент / АНОК «Музей будущего», Рос. ин-т культурологии [и др.] ; сост. А. В. Лебедев. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 320 с.

*9.* Музей и демократия : сб. науч. тр. / М-во культуры РФ. Рос. акад. наук. Рос. ин-т культурологии; редкол.: Н. А. Никишин (отв. ред.) [и др.]. – М. : РИК, 1997. – 150 с. – (Сер. электронных изданий. MUSEUM-PRO. Вып. 1.0.).

*10.* Музей і наведвальнік : матэрыялы навук.-практ. семінара (24–25 лістап. 1998 г.) / рэдсавет: З. Шыбека (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – 43 с.

*11.* Музей і наведвальнік : сацыял. даслед. (на базе Нац. мастац. музея Рэсп. Беларусь) / пад навук. рэд. І. Р. Голубевай. – Мінск, 1999. – 52 с.

*12.* Музей и новые технологии : сб. науч. тр. / М-во культуры РФ. Рос. акад. наук. Рос. ин-т культурологии ; сост. и науч. ред. Н. А. Никишин. – М., 1999. – 216 с.

*13.* Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі музейнай работы з дзецьмі : навук.-метад. зб. / уклад. В. У. Міронччык. – Мінск : БелІПК, 1997. – 71 с.

*14.* Музейная экспозиция. Теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции : сб. науч. тр. / М-во культуры РФ. Рос. акад. наук. Рос. ин-т культурологии ; редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.) [и др.]. – М. : РИК, 1997. – 222 с.

*15. Портер, Д.* Роль музея как средства коммуникации / Д. Портер // Museum. – 1983. – № 138. – С. 10–11.

*16. Стронг, Р.* Музей и коммуникация / Р. Стронг // Museum. – 1983. – № 138. – С. 3–9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Стэнтон, Д.* Коммуникация и средства коммуникации: некоторые проблемы экспонирования / Д. Стэнтон // Museum. – 1983. – № 139. – С. 28–33.

*18.* Терминологические проблемы музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР. – М., 1986. – 135 с.

*19. Юренева, Т. Ю.* Музей в мировой культуре / Т. Ю. Юренева. – М. : Русское слово – РС, 2003. – 536 с.

*20. Ян, И.* Музееведение как научная и учебная дисциплина и ее функция в естественно-исторических музеях. История, современное состояние и теоретические основы / И. Ян // Некоторые теоретические проблемы музееведения. – М., 1981. – С. 13–19. – (Сер.: Музееведение и охрана памятников. Реставрация и консервация музейных ценностей : науч. реф. сб. / Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина. Информкультура; вып. 2).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі музейнай справы.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Формы і змест самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, падрыхтоўка прэзентацый, складанне бібліяграфічных спісаў і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас семінарскіх і лекцыйных заняткаў, а таксама ў час правядзення экзамену.

Выкладчык-прадметнік знаёміць студэнтаў са спецыфікай той ці іншай самастойнай работы і спосабамі яе кантролю падчас уводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа*
*і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,45. Ул.-выд. арк. 0,95. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ